Камунiстычная партыя (бальшавiкоў) Беларусi

# Калгасная Капыльшчына

Орган Копыльскага РК КП(б)Б.

№ 18 (1771) ПЯТНИЦА 21 красавика 1944 г.

Смерць нямецкім акупантам

**По папярэдних даных к исходу 14 красавика войски 4-га Украинскага фронта и Асобнай Прыморскай Армии, у вынику имклівага наступлення у Крыму, узяли у палон звыш 37 тысяч нямецких салдат и афицэрау.**

## ХУТЧЭЙ И БОЛЬШ ЗАСЕЯЦЬ

Вясна 1944 года—вясна слаўных перамог Чырвонай Арміи. У трэцюю ваенную вясну расшырыўся и фронт земляробства Совецкай краины. Ужо свабодным правом дзиць веснавыя палявыя работы сялянства вызваленых раёнаў Украины, Малдавии, Крыма, Палескай, Гомельскай абласцей и рада других раёнау Беларуси.

Натхнёнае гистарычными перамогами Чырвонай Армии, калгаснае сялянства Совецкай краины у гэту вясну з небывалым пад'ёмам вышла на палявыя работы, хутка и добраякасна праводзиць сяўбу. Дабицца высокага ураджаю, даць найбольш краине и Чырвонай Армии хлеба и прадуктау—пад таким лозунгам працуюць сяляне Совецкага Саюза.

У гэту вясну таки лозунг павинен быць и у нас, хаця мы яшчэ знаходзимся пад крывавым гаспадараннем нямецких акупантау. Але зусим ня доуга ужо засталоея им гаспадарыць у нашых раёнах. Ураджай гэтага года мы будзем сабираць не для крыважэрных фрыцау, а для самих сябе. Пагэтаму мы павинны мабилизаваць усе силы и сродки, каб паспяхова правесци веснавую сяўбу и забяспечыць гэтым самым добры ураджай.

Ужо устанавилася цеплая веснавая пагода. У некаторых вёсках раёна распачалися палявыя работы. Зараз-жа павинны выйсци у поле усе сяляне.

Безумоўна, у правядзенни веснавой сяўбы гэтага года сустрэнуцца небывалыя цяжкасци—недахоп цягавай и рабочай силы, инвентара, насення и г. д., к таму яшчэ вораг имкнецца сарваць сяўбу. Але мы павинны адалець усе цяжкасци. Неабходна арганизаваць памиж сабою узаемную выручку и дапамогу, з тым каб кожная гаспадарка засеяла сваё поле. Трэба каб бесперабойна працавали кузницы, якия-б поўнасцю забяспечыли рамонт сельскагаспадарчага инвентара. Неабходна даць максимальную нагрузку цягавай силе, забяспечыць насеннем тых, у каго няма.

**Працоўныя сяляне!** Прышоу гарачы и рашаючы час. Усе, як адзин, выходзьце на палявыя работы. Прыкладайце усе силы, каб хутка и добраякасна правесци сяўбу. Дапамагайце адзин другому цягавай силай, насеннем, инвентаром. Дапамагайце сем'ям, у яких няма рабочых рук, каб их поле таксама было засеяна. Кали мы забяспечым высоки ураджай, то гэта будзе адзин з найлепшых падарнау нашай вызвалицельницы Чырвонай Армии.

## Страты працiўника и трафеи войск 2-га Украинскага фронта

Войски 2-га Украинскага фронта пад камандаваннем Маршала Совецкага Саюза Конева, у вынику праведзеных наступальных аперацый, з 6 сакавика па 15 красавика г. г. нанесли працiунику наступныя страты у жывой силе и тэхницы:

Знишчана: самалётау—142, танкау и самаходных гармат—668, гармат розных калибрау—1474, минамётау—1838, кулямётау—3560, бронемашын и бронетранспарцёрау—356, аутамашын—25111, цягачоу—248, павозак—6453, коней—8740, складау з боепрыпасами и ваенна-тэхничнай маёмасцю—63.

Працiунік астáвиу на поли боя 118400 трупау салдат и афицэрау.

За гэты-ж час войски 2-га Украинскага фронта захапили наступныя трафеи: самалётау—27, танкау и самаходных гармат—731, палявых гармат розных калибрау—1353, минамётау—1156, кулямётау—2090, винтовак—27093, бронемашын и бронетранспарцёрау—204, аутамашын—13096, цягачоу—149, радыёстанцый—198, павозак—1470, коней—6260, паравозау—71, вагонау—4009, снарадау—6340000, складау—73. Узята у палон 27393 нямецких салдат и афицэрау.

Такім чынам, агульныя страты немцау на галоуных видах баявой тэхники и у жывой силе за час наступальных аперацый 2-га Украинскага фронта складаюць: палоннымі и забитыми 145793, самалетау—169, танкау и самаходных гармат—1419, гармат розных калибрау—2830, минаметау—2994, кулеметау—5750, бронемашын и бронетранспарцёрау—560, аутамашын—40207. **Совинформбюро.**

## ДЗЕЯННИ НАШАЙ АВИЯЦЫИ

15 и 16 красавика наша авиацыя правяла масираваныя налёты на чыгуначную станцыю и порт Севастопаль.

Авиацыя Чорнаморскага флота наносиць непарыўныя удары па караблях працiуника на камуникацыях памиж Севастопалем и партами Румынии. Тольки за 16 красавика совецкия лётчыки патапили 4 транспарты працiуника агульным водазмяшчэннем у 15 тысяч тон и адзин минаносец.

17-18 красавика совецкая авиацыя зрабила масираваныя налёты на румынския гарады Галац и Канстанца.

19 красавика наша авиацыя зрабила масираваны налёт на горад и чыгуначны вузел Львоў.

# НА ФРАНТАХ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

На працягу 13 и 14 красавика на паудневы захад ад г. Одэса нашы войски вяли наступальныя баи, у выніку якіх авалодали райцэнтрам Одэскай обл. **Овидзиополь,** поунасцю ачысцили ад працiуника усходни бераг Днястроускага лимана и заняли рад населеных пунктау.

Войски 4-га Украинскага фронта, развиваючы наступленне, 13 красавика, у выніку имклівай атаки танкавых злучэнняу и пяхоты, авалодали сталицай Крыма **горадам Симферопаль**—асноуным апорным пунктам абароны працiуника, прыкрываючым шляхи к партам паудневага узбярэжжа Крымскага паувострава, **горадам и портам на Чорным моры Евпаторыя**—важным апорным пунктам абароны немцау на заходним узбярэжжы Крыма, а таксама з баями заняли больш 500 других населеных пунктау, у тым лику райцэнтры Крыма **Джурги, Ак-Шэйх.** Развиваючы паспяховае наступленне, войски фронта 14 красавика авалодали райцэнтрами Крыма **г. Бахчысарай, г. Алушта, г. Саки, Ак-Мечаць, Фральдорф, Зуя,** а таксама заняли больш 300 других населеных пунктау.

Войски **Асобнай Прымарскай Армии** прарвали абарону працiуника на Ак-Манайских пазицыях и, развиваючы наступленне, 13 красавика авалодали горадам и портам на Чорным моры **Феадосия,** а таксама з баями заняли 100 других населеных пунктау, у тым лику райцэнтры Крыма **г. Стары Крым, Ислам-Тэрэк,** вузлавую чыгуначную станцыю **Владиславовка.**

Праследуючы адступаючага працiуника, войски **Асобнай Прымарскай Армии** 14 красавика авалодали райцэнтрами Крыма **г. Карасу базар, г. Судак, Ички,** а таксама заняли больш 200 других населеных пунктау.

На працягу 14 красавика на паудневы захад ад г. Чэрткоу нашы войски вяли наступальныя баи, у ходзе якіх авалодали райцэнтрами Тарнопальскай обласци **Тлусце,** а таксама заняли больш 40 других населеных пунктау.

Войски 1-га **Украинскага** фронта пасля упорных вуличных баёу 15 красавика поунасцю авалодали абласным цэнтрам Украины **г.Тарнополь**—буйным чыгуначным вузлом и моцным апорным пунктам абароны немцау на Львоускім напрамку. Акружаны у Тарнопали гарнизон немцау з астаткау 4-х пяхотных дывизий и рада асобных часцей, агульнай колькасцю у 16000 чалавек, поунасцю знишчан, за выключэннем 2400 нямецких салдат и афицэрау, якия здалися у палон.

Войски **Асобнай Прымарскай Армии,** развиваючы наступленне, 16 красавика авалодали портам и горадам **Ялта,** а таксама з баями заняли больш 40 других населеных пунктау, у тым лику горад **Алупка.**

На Кишынеуским напрамку нашы войски вяли баи па расшырэнню плацдарма на правым беразе Днястра и палепшыли свае пазицыи.

На Севастопальским напрамку нашы войски за час з 15 па 19 красавика вяли наступальныя баи и авалодали райцэнтрами Крыма **Албах, г. Балаклава** и радам других населеных пунктау.

На працягу 18—20 красавика на усход ад г. Станислау нашы войски адбивали атаки пяхоты и танкау працiуника и нанесли яму вялікия страты у жывой силе и тэхницы.

# Брацкая дапамога

Калгаснiки Яраслаускай обласци пасылаюць у вызваленыя раёны Беларуси 3380 галоу буйнай рагатай жывёлы, 5360 авец, 1720 свиней. Апрача таго, калгасы обласци выдзяляюць для прадажы у раёны Беларуси яшчэ 50 тысяч галоу жывёлы.

Яраслауцы паслали падарки вызваленым братом—21 тысячу метрау тканины, 1500 пар абутку, 11 тысяч камплектау пасуды.

## Узарвали шэсць машын

За пятнаццаць дзен красавика месяца некальки груп атрада Д. падарвали на минах шэсць нямецких аутамашын з грузами и жывой силай на дарогах Масква—Варшава, Копыль—Слуцк, Новы Свержань—Несвиж. У выніку узрыву забита дваццаць чатыры и ранена восимнаццаць гитлерауцау.

Так выконваюць партызаны узятае абавязацельства дастойна сустрэць 1-ае мая.

## Заданне выканали

Камандзир узвода таварыш Н. з атрада П. з групай партызан на дарозе Несвиж-Столбцы паставили мину. Праязжаушая машына з жывой силай працiуника была падарвана, у выніку чаго забита 8 и ранена 10 гитлерауцау. Адначасова гэта група знишчыла на гэтай дарозе 10 клм. тэлефонна-тэлеграфнай сувязи.

## Немцы паляць будынки

На-днях у вёсках Кудзинавичы, Пацейки и других гитлерауцы спалили усе калгасныя и грамадския будынки. У некаторых вёсках яны адабрали у сялян сельскагаспадарчы инвентар. Аб чым гавораць гэтыя факты?

Яны гавораць аб тым, што нямецкия акупанты спяшаюць загадзе правесци свае планы максимальнага аграблення и вынишчэння нашага края, бо хутка им у гэтым перашкодзиць Чырвоная Армия. **Иван Падгорны.**

## Новая правакацыя

К якім тольки правакацыям не прыбягаюць нямецкия изверги для ажыццяулення сваих планау знишчэння беларускага народа. На днях яны а'бявили мабилизацыю рабочай силы на леса распрацоуки.

**Працоуныя раёна! Не паддавайцеся на гэту новую правакацыю гитлерауцау, не з'яуляйцеся к им. Помните, што пад гэтай шырмай немцы хочуць заманиць вас к сабе з мэтай знишчэння и зрыву веснавой сяубы.**

РЭДКАЛЕГИЯ